# *§ 50–0. Сацыяльна-эканамічнае развіццё БССР у другой палове 1940-х — 1991 г.

**ІНДУСТРЫЯЛЬНАЕ ГРАМАДСТВА**
**САЛІГОРСК НАВАПОЛАЦК**
**МЕЛІЯРАЦЫЯ ХІМІЗАЦЫЯ**
**НАВУКОВА-ТЭХНІЧНАЯ РЭВАЛЮЦЫЯ**
**РЫНАЧНАЯ ЭКАНОМІКА**

**1. Подзвіг беларускага народа па аднаўленні эканомікі і сацыяльнай сферы. Дапамога саюзных рэспублік.** У выніку Вялікай Айчыннай вайны і нацысцкай акупацыі ў Беларусі цалкам або часткова былі разбураны 209 гарадоў, не менш чым 12 868 сельскіх населеных пунктаў, 290 з іх падзялілі лёс Хатыні.

Наступствы вайны

Беларусь страціла больш за палову нацыянальнага багацця. Па стане эканамічнага развіцця наша краіна была адкінута да ўзроўню 1928 г., а па такіх найважнейшых галінах, як прамысловасць і энергетыка, — да паказчыкаў 1913 г. У вызваленай БССР дзейнічала толькі 2 % даваенных энергетычных магутнасцей. За гады вайны была фактычна знішчана матэрыяльна-тэхнічная база калгасаў і саўгасаў.



Што значыць выраз «падзяліць лёс Хатыні»?

У гады Вялікай Айчыннай вайны загінуў кожны трэці жыхар Беларусі. Паводле ацэнак спецыялістаў, Беларусь болей, чым якая-небудзь іншая краіна Еўропы, пацярпела ад вайны.

Пасля Вялікай Перамогі стваральная праца беларускага народа, як і ўсіх народаў СССР, была скіраваная на аднаўленне краіны, стварэнне спрыяльных умоў для развіцця нацыянальнай эканомікі і культуры, павышэння народнага дабрабыту.

Аднаўленне народнай гаспадаркі

Аднаўленне прамысловасці і іншых галін эканомікі пачалося адначасова з вызваленнем Беларусі

ўвосень 1943 г. У верасні 1946 г. Вярхоўны Савет БССР прыняў Закон аб чацвёртым пяцігадовым плане аднаўлення і развіцця народнай гаспадаркі рэспублікі на 1946–1950 гг., які быў складовай часткай агульнасаюзнага плана. Ён прадугледжваў не толькі аднаўленне, але і значны рост эканомікі, перш за ўсё машынабудавання. Больш хуткія тэмпы прамысловага развіцця планаваліся ў заходніх абласцях Беларусі.

Адной з найбольш істотных праблем была нястача рабочых рук. Асноўны цяжар аднаўлення лёг на плечы жанчын, падлеткаў і старых. Вялікую дапамогу Беларускай ССР аказалі іншыя рэспублікі Савецкага Саюза, якія накіравалі ў нашу рэспубліку інжынераў, тэхнікаў, кваліфікаваных рабочых. У БССР ішлі вагоны з сыравінай, станкамі і абсталяваннем.

## ПРАВОДЗІМ МІНІ-ДАСЛЕДАВАННЕ



*Г. Валгаград (Расійская Федэрацыя)*




*Г. Гомель (другая палова 1940-х гг.)*




*Асабістая кніжка ўдзельніка аднаўлення Мінска (1944 г.)*

*1. Выкарыстоўваючы дадатковыя крыніцы інфармацыі, даведайцеся:*
*— як звязаныя мемарыял «Дом Паўлава» ў г. Валгаградзе і аднаўленне беларускіх гарадоў;*
*— як звязаныя дом на першай ілюстрацыі і дом па адрасе: г. Мінск, пр. Незалежнасці, 31.*
*2. Прывядзіце прыклады дапамогі савецкіх рэспублік у аднаўленні БССР пасля Вялікай Айчыннай вайны.*

### Дапамога саюзных рэспублік

Згуртаванасць і гераізм савецкіх людзей, якія атрымалі агульную перамогу ў Вялікай Айчыннай вайне, сталі падмуркам іх пасляваеннага братэрства і ўзаемадапамогі. БССР, як адна з найбольш пацярпелых ад вайны савецкіх рэспублік, у кароткія тэрміны не змагла б аднавіць усё тое, што было разбурана без дапамогі саюзнага цэнтра і іншых саюзных рэспублік Савецкага Саюза. Яшчэ ішла вайна, але па меры вызвалення Беларусі ў 1943–1944 гг. рэспубліка атрымала ў парадку брацкай дапамогі ад працоўных шэрагу абласцей РСФСР каля 500 вагонаў з абсталяваннем. Усяго ў рэспубліку ў гэты перыяд было накіравана каля 1000 станкоў, 100 аўтамашын, 3000 трактароў, 2 тыс. тон металу, на мільёны рублёў тканін, абутку, трыкатажных вырабаў, 10 тыс. плугоў і шмат іншай сельскагаспадарчай тэхнікі.

Вялікую дапамогу аказалі саюзныя рэспублікі ў выкананні плана 4-й пяцігодкі аднаўлення і развіцця народнай гаспадаркі. У Беларусь накіроўвалася прамысловае абсталяванне, будаўнічыя матэрыялы, нафтапрадукты, адзенне, абутак і іншыя тавары. Найбольшую падтрымку аказвалі народы Расійскай Федэрацыі. 37 вагонаў з абсталяваннем, інструментамі, будаўнічымі матэрыяламі, сталлю, і каляровымі металамі даслалі Беларусі працоўныя Удмурцкай АССР. Ад калектыву Томскай ГЭС паступіла 17 вагонаў з энергаабсталяваннем, а калектыў Краснаярскай ГЭС даслаў турбіну магутнасцю ў 3 тыс. кВт. Толькі за першыя два з паловай гады пасля вызвалення ад акупацыі ў БССР з іншых рэгіёнаў Савецкага Саюза было завезена звыш 50 000 адзінак прамысловага абсталявання. Да 1947 г. з саюзных рэспублік у БССР было пастаўлена 10 тыс. аўтатранспартных сродкаў, дзясяткі тысяч тон хлеба, 150 тыс. галоў буйной рагатай жывёлы.

Дапамога аказвалася не толькі па ініцыятыве ўладаў, але таксама простых жыхароў гарадоў і пра-

цоўных калектываў Расіі, а таксама іншых саюзных рэспублік. Рабочыя з Кіраўскай вобласці дапамагалі аднаўляць прамысловыя прадпрыемствы Гомеля, Ульянаўская вобласць дапамагала ў аднаўленні Мазыра, Мардоўская АССР узяла шэфства над шэрагам гарадоў і раёнаў Гомельскай вобласці, Пермская чыгунка ўзяла шэфства над Беларускай чыгункай. Тысячы спецыялістаў народнай гаспадаркі прыбылі з Расіі, Украіны і іншых рэспублік, што было абумоўлена рэзкім недахопам кадраў у рэспубліцы.

У надзвычай цяжкіх умовах праходзіла аднаўленне транспарту, жыллёвага фонду, бальніц і школ. Пасляваеннае адраджэнне было працягам подзвігу, здзейсненага ўсім савецкім, у тым ліку і беларускім, народам у гады Вялікай Айчыннай вайны.

Ужо ў 1948 г. прамысловасць рэспублікі паводле аб'ёму выпуску прадукцыі перасягнула даваенны ўзровень.

Чым, на вашу думку, было абумоўлена прыярытэтнае развіццё цяжкай прамысловасці ў БССР у першае пасляваеннае дзесяцігоддзе?

**2. Асноўныя этапы развіцця эканомікі БССР. Структура эканомікі.** У першае пасляваеннае дзесяцігоддзе ў БССР змянілася структура прамысловай вытворчасці: скарацілася ўдзельная вага харчовай, лёгкай, лясной, дрэваапрацоўчай прамысловасці, вытворчасці будаўнічых матэрыялаў; значна павялічылася доля машынабудаўніцтва, металаапрацоўкі і электраэнергетыкі. Вядучай галіной прамысловасці рабілася машынабудаванне.

**Поспехі пасляваеннага аднаўлення прамысловасці ў БССР**

| | |
|---|---|
| 1947 г. | На Мінскім аўтамабільным заводзе выпушчаны першыя аўтамабілі-самазвалы МАЗ-205 |
| 1950 г. | Пачатак серыйнага вырабу трактароў на Мінскім трактарным заводзе. У 1953 г. з галоўнага канвеера МТЗ сышоў першы колавы трактар «Беларусь» |
| 1950 г. | Выпрацоўка электраэнергіі на 50 % перавысіла даваенны ўзровень |
| 1950 г. | У заходніх абласцях БССР аб'ём прамысловай прадукцыі амаль удвая перасягнуў узровень 1940 г. |

Ад сярэдзіны 1950-х гг. адначасова з захаваннем высокіх тэмпаў развіцця цяжкай прамысловасці ў БССР пачалі надаваць больш увагі развіццю вытворчасці тавараў народнага спажывання.

Аднаўленню і развіццю сельскай гаспадаркі ў БССР спрыялі захады, зробленыя савецкім кіраўніцтвам у 1953 г.: павелічэнне закупачных цэн на сельгаспрадукцыю, спісанне запазычанасці калгасаў, змяненне сістэмы падаткаабкладання асабістага надзелу селяніна (ён пачаў плаціць з памеру зямельнай плошчы, а не з таго, што на ёй вырошчвалася); павелічэнне фінансавых укладанняў у сельскую гаспадарку.

Якім чынам зробленыя захады маглі паўплываць на развіццё сельскай гаспадаркі?

У выніку зробленых захадаў сельская гаспадарка Беларусі ўпершыню за пасляваенны перыяд зрабілася рэнтабельнай. Ужо ад 1950-х гг. БССР перастала

Даведайцеся, што значыць паняцце «рэнтабельнасць».

## ГІСТОРЫЯ І СУЧАСНАСЦЬ

У перыяд пасляваеннай індустрыялізацыі ў БССР паўсталі заводы-гіганты — гонар беларускага народа: Мінскі трактарны завод (МТЗ), Беларускі аўтамабільны завод (БелАЗ), Мінскі аўтамабільны завод (МАЗ). Яны зрабіліся асновай эканамічнай спецыялізацыі БССР. Прадукцыя гэтых прадпрыемстваў і ў нашы дні вылучаецца высокай якасцю і надзейнасцю, паспяхова канкурыруе на сусветным рынку.

1. *Выкарыстоўваючы дадатковыя крыніцы інфармацыі, даведайцеся, якія яшчэ прадпрыемствы былі пабудаваныя ў БССР у першае пасляваеннае дзесяцігоддзе. Ці ёсць такія прадпрыемствы ў вашым рэгіёне?*
2. *Складзіце топ-5 дасягненняў індустрыяльнага развіцця БССР у 1945–1991 гг. Якія фактары абумовілі дасягненні БССР у гэтай сферы ў згаданы перыяд?*
3. *Падрыхтуйце паведамленне аб гісторыі развіцця аднаго з прамысловых прадпрыемстваў Беларусі. Прааналізуйце, як яно змянілася ад моманту заснавання да нашых дзён.*

быць датацыйнай рэспублікай і аж да распаду СССР папаўняла саюзны бюджэт.

Ва ўмовах навукова-тэхнічнай рэвалюцыі ў БССР пераважнае развіццё атрымалі галіны, якія вызначалі тэхнічны прагрэс: прыборабудаўнічая, радыётэхнічная, хімічная, нафтахімічная, паліўна-энергетычная. У 1963 г. быў уведзены ў строй першы Салігорскі калійны камбінат, у 1964 г. — Светлагорскі завод штучнага валакна. Пачалося будаўніцтва найбуйнейшага ў Еўропе лаўсанавага камбіната ў Магілёве. Па тэмпах развіцця прамысловасць БССР перасягала агульнасаюзныя паказчыкі.

Успомніце, што такое навукова-тэхнічная рэвалюцыя.

**БССР — індустрыяльная рэспубліка**

У 1960 г. адносная доля прамысловасці ў рэспубліканскім унутраным нацыянальным даходзе склала 52 %.

Успомніце асноўныя мерапрыемствы эканамічнай рэформы 1965 г.

Самай паспяховай для БССР і СССР у цэлым была восьмая пяцігодка (1966–1970 гг.). Валавы ўнутраны прадукт (ВУП) вырас больш чым на 50 %. У гэты час рэспубліка стала пляцоўкай для паспяховай апрабацыі (у першую чаргу ў галіне лёгкай прамысловасці) эканамічнай рэформы А. М. Касыгіна, першым намеснікам якога быў беларус К. Т. Мазураў. Значная ўвага надавалася сельскай гаспадарцы, зацікаўленасці ў выніках працы, умацаванню матэрыяльнай базы калгасаў і саўгасаў.

**Экстэнсіўны шлях развіцця эканомікі** — шлях развіцця, пры якім рост вытворчасці забяспечваецца за кошт колькасных, а не якасных паказчыкаў.

У 1970-я гг. рост ВУП у БССР пераўзыходзіў адпаведныя паказчыкі большасці рэспублік Савецкага Саюза, а таксама Аўстрыі, Венгрыі, Балгарыі. Аднак крыніцай росту ВУП у значнай ступені заставаўся **экстэнсіўны шлях развіцця**.

Важнае значэнне для развіцця эканомікі мела сельскагаспадарчая вытворчасць, дзе НТР спрыяла пашырэнню ў першую чаргу механізацыі і хімізацыі. У БССР будавалі буйны́я механізаваныя фермы і комплексы па вытворчасці мяса і малака, дзе ўтрымлівалі тысячы галоў буйной рагатай жывёлы, але пры гэтым асноўную частку кармоў завозілі з-за

межаў рэспублікі. На меліяраваных землях вырошчвалі да траціны ўсёй прадукцыі раслінагадоўлі і 40 % кармоў. Але ў шэрагу выпадкаў хімізацыю, канцэнтрацыю вытворчасці і меліярацыю праводзілі без глыбокай навуковай прапрацоўкі. Таму паўсталі новыя экалагічныя праблемы, звязаныя з забруджваннем глебы і вады, якія давялося вырашаць у другой палове 1970-х — 1980-я гг.




*Паштовая марка СССР. 1966 г.*

Як на выяве адлюстраваныя працэсы хімізацыі і меліярацыі? Якія экалагічныя праблемы паўсталі ў выніку іх правядзення? Як іх можна было пазбегнуць?

У 1980 г. у Беларусі дзейнічала каля 200 вытворчых і навукова-вытворчых аб'яднанняў. Народнагаспадарчы комплекс БССР характарызаваўся высокім узроўнем кваліфікацыі рабочага класа, вялікай канцэнтрацыяй інтэлекту, фундаментальнай і прыкладной навукі. Эканоміка Беларусі набыла выразны экспартаарыентаваны характар. У 1985 г. 300 прадпрыемстваў рэспублікі пастаўлялі прадукцыю больш чым у 100 краін свету.

Разам з тым укараненне навуковых распрацовак у сферу вытворчасці адбывалася марудна. Гэта, у прыватнасці, было абумоўлена тым, што для прадпрыемстваў больш выгадным было выкананне плана па валавым паказчыку пры нязначных новаўвядзеннях, не звязаных з вялікімі выдаткамі на рэалізацыю навуковых дасягненняў.

### Запаволенне сацыяльна-эканамічнага развіцця

Да пачатку 1980-х гг. запаволіўся рост ураджайнасці асноўных сельскагаспадарчых культур, высокімі заставаліся страты сельскагаспадарчай прадукцыі падчас уборкі, транспарціроўкі і захавання (гублялася да 49 % бульбы, 33 % гародніны, 20 % збожжа). У выніку адтоку моладзі з вёскі скарацілася колькасць падсобных гаспадарак калгаснікаў, якія раней давалі значную колькасць малака, мяса і бульбы. Стварэнне Беларускага аграрна-прамысловага комплексу «Белаграпрам» дазволіла сканцэнтраваць рэсурсы, але не вырашыла асноўных праблем у сельскай гаспадарцы.

У сярэдзіне 1980-х гг. было заяўлена пра неабходнасць паскарэння сацыяльна-эканамічнага развіцця.

**Інтэнсіўны шлях развіцця эканомікі** — шлях развіцця, звязаны з ростам вытворчасці на аснове паляпшэння якасных паказчыкаў, за кошт укаранення ў вытворчасць дасягненняў навукі і тэхнікі і павелічэння прадукцыйнасці працы.

Гэты курс прадугледжваў пераход на **інтэнсіўны шлях развіцця эканомікі**. Ад лета 1987 г. асноўнай задачай ставілася ажыццяўленне пераходу ад пераважна адміністрацыйных да эканамічных (рыначных) метадаў кіравання народнагаспадарчым комплексам краіны. Аднак спадзяванні на тое, што рынак сам усё адрэгулюе, не спраўдзіліся.

У другой палове 1980-х гг. развіццё эканомікі ў БССР было супярэчлівым. Разам з ростам эканамічнага патэнцыялу рэспублікі, нязначным дэфіцытам бюджэту, адноснай раўнавагай спажывецкага рынку назіраліся зніжэнне асноўных эканамічных паказчыкаў і прыкметы крызіснай сітуацыі. Асобныя прадпрыемствы прастойвалі з прычыны недапастаўкі сыравіны, камплектуючых з іншых раёнаў СССР. Пачала расці інфляцыя, упершыню ў мірны час у БССР уводзіліся талоны на прадукты і некаторыя тавары доўгачасовага карыстання.

### Павышэнне ўзроўню жыцця насельніцтва

**3. Сацыяльнае развіццё.** У 1946 г. была павялічаная заработная плата ў асноўных галінах прамысловасці. Нізкааплатныя катэгорыі рабочых і служачых, студэнты і пенсіянеры атрымалі так званую хлебную надбаўку, уведзеную ў сувязі з падрыхтоўкай да адмены картачнай сістэмы (1947 г.).

У выніку грашовай рэформы адбылося першае зніжэнне цэн. У 1949–1950 гг. цэны знізіліся на большасць тавараў.

У 1960-я гг. калгаснікі атрымалі права на пенсію і гарантаваную аплату працы.

Як вы лічыце, з чым было звязана змяненне напрамку міграцыйных працэсаў у БССР у сярэдзіне 1960-х гг.?

Для пасляваеннага развіцця БССР была характэрная вялікая міграцыя насельніцтва ў іншыя рэспублікі СССР: жыхары вёсак з’язджалі ў раёны Калінінградскай вобласці, Карэла-Фінскай ССР, а пасля на асваенне цалінных і абложных зямель Казахстана, на Урал і ў Сібір. Ад сярэдзіны 1960-х гг. міграцыя насельніцтва з Беларусі значна паменшылася, а ў Беларусь, наадварот, вырасла.

Адбыліся змены ў структуры сям’і. Сям’я, у якой было 1–2 дзіцяці, паступова пачала дамінаваць не толькі ў горадзе, але і ў сельскай мясцовасці. Дэмаграфічная сітуацыя 1960–1980-х гг. характарызавалася зніжэннем тэмпаў росту насельніцтва.

**«Спажывецкая рэвалюцыя»**

Рост рэальных даходаў насельніцтва прывёў у 1970-я гг. да так званай «спажывецкай рэвалюцыі». У паўсядзённым жыцці шырэй пачалі выкары-

## ГІСТОРЫЯ І СУЧАСНАСЦЬ

**Пастанова Саўміна СССР, ЦК ВКП(б)**
от 14 снежня 1947 года № 4004



1. Адначасова з правядзеннем грашовай рэформы, гэта значыць з 16 снежня 1947 г., адмяніць картачную сістэму забеспячэння харчовымі і прамысловымі таварамі, высокія цэны па камерцыйным гандлі і ўвесці адзіныя зніжаныя дзяржаўныя рознічныя цэны на прадукты харчавання і прамысловыя тавары.

2. Пры ўсталяванні адзіных рознічных дзяржаўных цэн на харчовыя і прамысловыя тавары зыходзіць з наступнага:

а) на хлеб і муку знізіць кошты ў сярэднім на 12 % супраць цяпер дзеючых пайковых коштаў;

б) крупы і макароны знізіць кошты ў сярэднім на 10 % супраць цяпер дзеючых пайковых коштаў;

у) мяса, рыбу, тлушчы, цукар, кандытарскія вырабы, соль, бульба і гародніна захаваць цэны на ўзроўні дзеючых пайковых коштаў;

г) малако, яйкі, чай, садавіну ў адмену цяпер дзеючых высокіх камерцыйных цэн і занадта нізкіх пайковых цэн ўсталяваць новыя цэны ў дачыненні да ўзроўню дзеючых пайковых цэн на асноўныя харчовыя тавары;

д) тканіны, абутак, адзенне, трыкатажныя вырабы ў адмену цяпер дзеючых высокіх камерцыйных цэн і занадта нізкіх коштаў акурат унармаванага забеспячэння, усталяванага ў гарадах і працоўных пасёлках, усталяваць новыя цэны на ўзроўні ў 3,2 разы ніжэй камерцыйных цэн; (...)

4. Пры правядзенні грашовай рэформы заработная плата рабочых і служачых, а таксама даходы сялян ад дзяржаўных нарыхтовак і іншыя працоўныя даходы ўсіх слаёў насельніцтва не закранаюцца рэформай і будуць выплачвацца ў новых грошах у ранейшых памерах.

*Прывядзіце прыклады паляпшэння жыцця савецкіх грамадзян пасля правядзення рэформы 1947 г.З*

стоўваць бытавую тэхніку: пыласосы, пральныя машыны, кухонныя камбайны, электра- і газавыя пліты, халадзільнікі. У карыстанні насельніцтва знаходзілася значная колькасць аўтамабіляў. З'яўленне новых відаў сінтэтычных матэрыялаў дазволіла асвоіць вытворчасць адзення з капрону, нейлону, штучнага футра. Аднак айчынная лёгкая прамысловасць не магла задаволіць узрослыя патрэбы насельніцтва ў якаснай прадукцыі.

**Нарастанне негатыўных з'яў**

Істотным фактарам, які аказаў уплыў на сацыяльнае развіццё, стала аварыя на Чарнобыльскай АЭС. Аварыя нанесла Беларусі шкоду, роўную 32 рэспубліканскім бюджэтам 1985 г. У зоне радыеактыўнага забруджвання аказалася каля 20 % усіх сельгасугоддзяў рэспублікі. Саюзная праграма ліквідацыі наступстваў аварыі на Чарнобыльскай АЭС была прынятая толькі ў 1990 г.

Крызісныя з'явы ў эканоміцы прывялі да ўнармавання спажывання на шэраг тавараў і ўвядзення напачатку 1990-х гг. картачнай сістэмы. Характэрнай адметнасцю пачатку 1990-х гг. былі велізарныя чэргі за прамысловымі і харчовымі таварамі.

**4. БССР у народнагаспадарчым комплексе Савецкага Саюза.** У пасляваенны перыяд роля БССР у народнагаспадарчым комплексе Савецкага Саюза змянілася. Беларусь захоўвала сваё значэнне як вытворца сельскагаспадарчай прадукцыі, перш за ўсё мяса і малака, бульбы і лёну. Аднаўленне лёгкай прамысловасці ў сярэдзіне 1950-х гг. спрыяла росту вытворчасці тканін (больш за 10 % агульнасаюзнай вытворчасці льняных тканін).

**Рост ролі цяжкай прамысловасці БССР**

Разам з тым змяненне структуры прамысловай вытворчасці садзейнічала росту долі БССР у вытворчасці станкоў, трактароў, аўтамабіляў. Амаль палова ўсіх прамысловых рабочых рэспублікі ў сярэдзіне 1950-х гг. была занятая ў паліўна-энергетычнай галіне, машынабудаванні, металаапрацоўчай прамысловасці і вытворчасці будаўнічых матэрыялаў. У сярэдзіне 1950-х гг. на долю БССР прыпадала каля 12 %

усёй саюзнай вытворчасці трактароў. Трактары «Беларусь» экспартавалі ў Індыю, Аб'яднаныя Арабскія Эміраты і інш. У вытворчасці грузавых аўтамабіляў БССР перагнала такія развітыя краіны, як Аўстрыя, Швецыя і Данія. Вытворчасць металарэзных станкоў склала каля 7 % ад іх агульнасаюзнага вырабу.

Імклівы рост прамысловасці абумовіў неабходнасць будаўніцтва ў БССР новых электрастанцый. Энергетыка краіны базавалася галоўным чынам на выкарыстанні торфу, у паліўным балансе яго адносная доля перавышала 50 %.



*Трактар «Беларусь» у Індыі. 1960-я гг.*

### Развіццё навукаёмістых галін прамысловасці

Навукова-тэхнічная рэвалюцыя прывяла да далейшых змен месца і ролі БССР у народнагаспадарчым комплексе СССР. Прыярытэтнае развіццё ў Беларусі атрымалі навукаёмістыя галіны: прыборабудаванне, электронная і радыёэлектронная прамысловасць, вытворчасць сродкаў сувязі.

Талент беларусаў, высокі ўзровень адукацыі паспрыялі фарміраванню магутнага кластара электроннай прамысловасці. Беларусь ператварылася ў высокатэхналагічны «зборачны цэх СССР».

Як вы разумееце выраз: «БССР — высокатэхналагічны зборачны цэх СССР»?

Асаблівае значэнне набылі беларускія радыёэлектроніка, оптыка і оптаэлектроніка. Оптыка-механічнае аб'яднанне (БелОМА) займала вядучыя пазіцыі ў аптычнай галіне СССР.

Магілёўскі аўтамабільны завод (МаАЗ) выпускаў цягачы. Галоўным іх прызначэннем была буксіроўка паўпрычэпных транспартна-загрузачных машын або транспартна-ўстановачных агрэгатаў для мантажу на стартавыя пазіцыі балістычных ракет сярэдняй далёкасці.

З чым, на вашу думку, быў звязаны рост ролі прадпрыемстваў ваенна-прамысловага комплексу ў эканоміцы БССР у другой палове XX ст.?

Паводле ацэнкі экспертаў Сусветнага банка, у 1991 г. у Беларусі былі адны з найвышэйшых сярод савецкіх рэспублік паказчыкаў даходу на душу насельніцтва, развіты прамысловы сектар, які з улікам яго долі ў ВУП адпавядаў узроўню адной з самых індустрыяльных краін свету. Крызіс у беларускай эканоміцы пачаўся пазней, чым у іншых рэспубліках СССР.

*У 1945–1991 гг. Беларусь дасягнула значных поспехаў у прамысловасці, аграрнай і сацыяльнай сферах. Дзякуючы працавітасці беларускага народа, яго еднасці і згуртаванасці ў кароткія тэрміны была аднаўлена народная гаспадарка пасля Вялікай Айчыннай вайны. Пасляваенная мадэрнізацыя ў БССР была праведзена дзякуючы выкарыстанню сацыяльна-эканамічнага патэнцыялу ўсяго Савецкага Саюза. На працягу пасляваенных дзесяцігоддзяў фарміраваўся сацыяльна арыентаваны характар эканомікі. Менавіта ў гэтыя гады Беларусь ператварылася ў краіну з высокім навуковым і тэхналагічным узроўнем, быў закладзены падмурак унікальнай эканамічнай мадэлі развіцця.*

**калі ў свеце…**

1974 г. — у Вялікабрытаніі праведзена першая аперацыя па перасадцы ныркі прафесарам П. Морысанам

**у Беларусі…**

1970 г. — у БССР праведзена першая аперацыя па перасадцы ныркі прафесарам М. Я. Саўчанкам

**ПЫТАННІ І ЗАДАННІ**

1. Ахарактарызуйце асноўныя тэндэнцыі эканамічнага і сацыяльнага развіцця БССР у 1945–1991 гг.
2. Чаму працэс аднаўлення народнай гаспадаркі БССР пасля Вялікай Айчыннай вайны — гэта працоўны ўсенародны подзвіг?
3. Выкарыстоўваючы дадатковыя крыніцы інфармацыі, знайдзіце агульныя і розныя рысы эканамічнай рэформы 1965 г. і пераўтварэнняў перыяду перабудовы.
4. Выкарыстоўваючы дадатковыя крыніцы інфармацыі, падрыхтуйце паведамленне (прэзентацыю) на тэму «Топ-5 дасягненняў БССР у сацыяльна-эканамічнай сферы ў пасляваенны перыяд».
5. Вызначце прыкметы інтэнсіўнага і экстэнсіўнага шляхоў развіцця эканомікі БССР у другой палове 1940-х — 1991 г. Чаму, нягледзячы на значныя дасягненні, сацыяльна-эканамічнае развіццё рэспублікі ў 1980-я гг. запаволілася?
6. Складзіце тэзісны план адказу на пытанне «БССР у народнагаспадарчым комплексе Савецкага Саюза».